Я.Р.Самуйлік (Целяханы БССР)

## АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ВЫГАНАЎСКАГА ПАЛЕССЯ

Выганаўскае Палессе знаходзіцца ў міжрэччы Ясельды (прыток Прыпяці) і Шчары (прыток Нёмана). Тут лакалізуецца целяханская (ці целяханска-лунінецкая) падгрупа паўночнабрэсцкіх гаворак.

Даследуемым гаворкам характэрна мяккасць губных і пярэднеязычных перад і (міска, піці, нізко, зіма), пярэднеязычных перад е (село, несу, земля), цеканне-дзеканне (дзед, цепэр, ціхо), што аб"ядноўвае іх з панямонскімі гаворкамі. З другога боку, тыповымі для целяханскіх гаворак з"яўляецца оканне (вода, молоко), цвёрдасць губных зычных перад е (мэд, вэсна) – рысы, якія аб"ядноўваюць іх з гаворкамі загародскімі (брэсцка-пінскімі). Спецыфічнай рысай даследуемых гаворак з"яўляецца, у прыватнасці, рэфлекс о > э ў новых закрытых складах пад націскам (мэй, твэй, нэс, стэл, кэнь, кэт).

Адзначым некаторыя лексічныя асаблівасці рэгіёна.

Лексемы, якія аб"ядноўваюць целяханскія гаворкі з гаворкамі Панямоння: драбіна "драбіны", лівэнь "лівень", хвоя "хвоя".

Лексемы, якія аб"ядноўваюць целяханскія гаворкі з Тураўшчынай: небога "пляменніца".

Лексемы, якія аб"ядноўваюць целяханскія гаворкі з Тураўшчынай і ўсходнім Загароддзем: бусько "бусел", ёжык "вожык", кубло "гняздо".

Лексемы, якія аб"ядноўваюць целяханскія гаворкі з Загароддзем і Тураўшчынай: волочыці "баранаваць", поночы "цёмна", цепэр "сення", чоботы "боты".

Лексемы, якія аб"ядноўваюць целяханскія гаворкі з Загароддзем: клуня "гумно", коворот "калодзежны жураве ль", копіца "капа сена", мусіт "мабыць", оболок "воблака", пролэй "лівень", сокорат куры "сакочуць куры", страміна "драбіны", супосіціса "сустрэцца".

Спецыфічныя лексемы Выганаўскага Палесся: дзюбэнь "дзюба ў птушак", журахвіны "журавіны", кокочут куры "сакочуць куры", краснік "падбярозавік", небож "пляменнік", облэйны дошч "лівень", овэчые грыбы "неядомыя грыбы", орабушок "верабей", повночы "цёмна", пэрэхмарок "воблака", равкае кэшка "мяўкае кошка", сковпэц "капец бульбы", страбіна "драбіны", цэха "радно".